# Прысвячэнне Пікаса

Ястраб Ф.А. Прысвячэнне Пікаса/Ф.А. Ястраб//
«PROдызайн». — 2004. — №10.



С. Далі. «Партрэт Пікаса»

Менавіта так называўся мастацкі праект, арганізатарамі якога выступілі галерэя «Універсітэт культуры» і ГА «Міжнародная гільдыя жывапісцаў». Праект гэты ажыццявіўся ў пачатку снежня 2003 года — года, які быў аб'яўлены ЮНЕСКА «Годам Пікасо». Па ацэнцы прэсы і многіх мастацтвазнаўцаў, «Прысвячэнне Пікасо» — лепшы арт-праект года. Удзел у ім прыняло каля пяцідзесяці аўтараў. Скульптурная частка экспазіцыі была прадстаўлена такімі імёнамі, як Уладзімір Слабодчыкаў, Канстанцін Селіханаў, Валянцін Борзды, Віктар Мінько, Аляксандр Плячкоў.

На суд аўдыторыі прадставілі свае аб'екты В. Васільеў і А. Нацэўскі, інсталяцыі — Аляксандр Родзін з групай маладых мастакоў. Чатыры залы галерэі змясцілі звыш 60 акварэльных і жывапісных работ. Сутнасць праекта заключалася ў тым, каб не толькі аддаць даніну пашаны геніяльнаму мастаку, але і паказаць, наколькі актуальны сёння яго ўплыў на сучаснае мастацтва, у тым ліку і на беларускае. Гэтым, у асноўным, і вызначаліся ўмовы ўдзелу мастакоў у праекце — так або інакш, тэматычна або стылістычна, а можа, сваім эксперыментальным характарам кожная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Г. Драздоў. «Таямніцарух».
Палатно, алей. 110х95. 2005



Г. Драздоў. «Рухакрок».
З серыі «Вышэй за хмарачосы».
Палатно, алей. 110х80. 2006



І. Лобан. «Старажытнае шкло».
Папера, акварэль. 44х54. 2007

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ




В. Гардыёнак-Кірэева. «Начны горад». Палатно, алей. 60х70. 2007

работа павінна была трапляць у «ідэю праекта». Гэта дало магчымасць убачыць многіх мастакоў з нечаканага для публікі боку. Адкрыта дэкаратыўныя работы, так непадобныя па сваёй пластыцы на манеру, якая выкарыстоўваецца аўтарам сёння, паказаў Аляксандр Грышкевіч. Прыемна здзівіў публіку сваёй абсалютна раскаванай, «растарможанай» пластыкай і дакладным пачуццём кампазіцыі, глыбінёй і нечаканасцю вобразаў другі Аляксандр — Верашчагін. Нібыта звычайны беларускі пейзаж у рабоце Ягора Батальёнка «Бераг» набывае амаль касмічнае гучанне. Касмічны Хаос, у якім, праўда, пры працяглым разглядзе пачынаюць злёгку ўгадвацца фігуры рэальнага свету, перамагае ў «Медытатыўнам экспромце» Аляксандра Родзіна, галоўнай рабоце выстаўкі (240х300).

Падкупілі шматлікіх гледачоў цудоўная калярова-тонавая рытміка палотнаў Сяргея Грыневіча, Віктара Шылко, Алега Скавародкі, Васіля Касцючэнкі; пявучая пластыка і тонкая каларыстыка работ Уладзіміра Кожуха, Рыгора Несцерава, Зоі Луцэвіч; каляровы феерверк гучных акордаў у адкрытай пяшчоце «Сіесты» Аляксандра Ксяндзова і «Данаі» Уладзіміра Ганчарука, у даведзеных амаль да знакавай пластыкі палотнах Івана Кліменкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Ф. Ястраб. «Сонечныя арэлі».
Палатно, алей. 75х75. 2005



У той час як Фёдар Ястраб здзяйсняў «Праменад па саду Пікасо», Сяргей Малішэўскі гнаў у невядомую далеч свой сюррэалістычны «Табун», Дзмітрый Маслій даводзіў да «кубічнага» стану «Фантазію на тэму», а Аляксандр Забаўчык ставіў апошні штрых на сваім кубічным «Сальвадоры».

Такая любімая Пабла Пікасо тэма П'еро і Арлекіна арыгінальна «заззяла» ў «Каханні П'еро» Рыгора Іванова і «Арлекіне з цыгарэтай» Сяргея Рымашэўскага...

Л. Карнеева. «Джокер».
Палатно, алей. 80х70. 2007



С. Давідовіч. «Новы дзень».
Палатно, алей. 75x85. 2008



В. Гардыёнак-Кірэева. «Майстэрня».
Палатно, алей. 70x60. 2007

Адным словам, выстаўка ўдалася. Яна атрымалася абсалютна арганічнай, цэласнай, экспазіцыйна выверанай.

Добра ўпісалася ў вернісаж музычнае суправаджэнне авангарднымі гуртамі. Сапраўдны ж тон вернісажу быў зададзенны трыма камандамі перформераў. Фестывальны дух гэтай выстаўкі, як мне здаецца, паслужыць добрым прыкладам для будучых праектаў.



Г. Данелян. «Усход».
Палатно, алей. 60x70. 2007

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ